# МУЗЕЯЗНАЎСТВА

УДК 645.5:069.5(476)

*В. М. Петражыцкая*

## Гадзіннікі ў зборах музеяў Мінскай вобласці: асаблівасці фарміравання і экспанавання

*Упершыню прааналізаваны матэрыял пра гадзіннікі ў зборах музеяў Мінскай вобласці сістэмы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, прадстаўлена іх тыпалогія і колькасны склад. Вызначаны шляхі паступлення гадзіннікаў у фонды музеяў і іх каштоўнасныя характарыстыкі як музейных прадметаў. Падкрэслена, што гадзіннік як узор матэрыяльнай культуры з'яўляецца крыніцай інфармацыі аб розных аспектах сацыяльнай рэчаіснасці, гісторыі, культуры, гаспадарчай дзейнасці, бытавых і эстэтычных уяўленнях людзей. Як носьбіты культурна значнай інфармацыі гадзіннікі разглядаюцца ў аспекце іх актуалізацыі экспазіцыйнымі метадамі. Выяўлены асноўныя тэмы агульнагістарычных, тэматычных і мемарыяльных экспазіцый, дзе найбольш паспяхова прадстаўлены гадзіннікі.*

*Аўтар прыходзіць да высновы, што даследаванні гадзіннікаў будуць садзейнічаць стварэнню культурна-гістарычнага асяроддзя і фарміраванню новых культурных форм у музеях.*

***Ключавыя словы:*** *гадзіннік, музейны прадмет, экспазіцыя, музей, матэрыяльная культура, рэчавыя помнікі, калекцыя, актуалізацыя, культурная каштоўнасць.*

*V. Petrazhytskaya*

## Clocks in the collections of museums of the Minsk region: features of formation and exposure

*For the first time, the article analyzes the material on watches in the collections of the museums of the Ministry of Culture of the Minsk Region, presents their typology and quantitative composition, determines the ways in which watches enter museum collections and their value characteristics as museum objects. The author emphasizes that watches as an example of material culture are a source of information about various aspects of social reality, history, culture, economic activity, everyday and aesthetic ideas of people. As carriers of culturally significant information, watches are considered in the aspect of their actualization by methods of influence. The article defines the main topics of general historical, thematic and memorial expositions, where watches are most successfully presented. The author comes to the conclusion that the study of watches will contribute to the creation of a cultural and historical environment and the formation of new cultural forms in museums.*

***Keywords:*** *Clock, museum item, exhibition, Museum, material culture, material monuments, collection, updating, cultural value.*

Музей – інстытуцыя, якая захоўвае і транслiруе матэрыяльныя сведчанні дзейнасці чалавека. Асноўнай мэтай музея можна назваць выхаванне людзей на лепшых узорах чалавечай культуры. Для будучых пакаленняў музей захоўвае і вывучае экспанаты, для сучаснікаў – паказвае і каментуе іх. Галоўным складнікам гэтай дзейнасці з’яўляецца музейны прадмет – першакрыніца ведаў і эмоцый, узяты «з асяроддзя бытавання <...> і ўключаны ў музейны збор»[1] [10, с. 56]. Рэчавы аб’ект павінен валодаць спецыфічнымі ўласцівасцямі музейнага прадмета (адлюстраванне рэчаіснасці, экспрэсіўнасць, рэпрэзентатыўнасць) і мець музейную каштоўнасць. У музеязнаўстве вылучаюць навуковую, гістарычную, мемарыяльную і мастацкую каштоўнасці. Менавіта каштоўнасныя характарыстыкі дазваляюць першапачаткова вылучыць прадмет з агульнага наваколля, а затым уключыць яго ў музейны збор.

Гадзіннікі – незвычайны музейны прадмет. У вырабе іх карпусоў удзельнічалі лепшыя мастакі свайго часу, у канструкцыях механізмаў выкарыстоўваліся апошнія дасягненні навукі і тэхнікі. Адпаведна, у музеях увага надаецца розным якасцям гадзіннікаў як рэчы: вонкаваму афармленню, асаблівасцям механізмаў. Гадзіннікі з’яўляюцца сведкамі пэўных эпох і канкрэтных падзей, таму іх даследаванне можа разгортвацца як асэнсаванне біяграфій рэчаў – эканамічных, тэхнічных, сацыяльных, якія «могуць адрозніваца самай рознай культурнай інфарматыўнасцю» [8, с. 139].

*Мэта артыкула* – даследаваць гадзіннікі ў зборах музеяў Мінскай вобласці сістэмы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь праз іх актуалізацыю экспазіцыйнымі метадамі. Раскрыццё мэты артыкула залежыць ад вызначэння асноўных шляхоў паступлення гадзіннікаў у музейныя фонды, аналізу іх тыпалогіі, колькаснага складу, каштоўнасных характарыстык, выкарыстання на пастаянных і часовых экспазіцыях музеяў.

Вывучэнне гадзіннікаў у калекцыях музеяў як новых для культуралогіі і музеязнаўства крыніц і ўключэнне іх у аб’ектнае поле навукі вызначаецца высокай ступенню актуальнасці. Літаратура, прысвечаная тэме гадзіннікаў у зборах музеяў Беларусі, фрагментарная. З апублікаваных навуковых даследаванняў адзначым артыкулы Л. Жук [4], І. Зварыкі [5], А. Селівончык [12]. Даследаванні гадзіннікаў са збораў музеяў Мінскай вобласці аўтарам не выяўлены. Працы абагульняючага характару пра гадзіннікі ў музейных зборах Беларусі адсутнічаюць. Вывучэнне гадзінніка як прадмета музейнага захоўвання і як помніка культуры прадугледжвае сістэмны ўсебаковы аналіз канкрэтных артэфактаў. Таму

[1] Цытаты даюцца ў перакладзе аўтара.

першаснай і галоўнай крыніцай звестак становяцца гадзіннікі, якія знаходзяцца ў зборах 22 раённых і 1 абласным музеі Мінскай вобласці. Інфармацыя пра гадзіннікі са збораў музеяў рэспубліканскага падпарадкавання, размешчаных на тэрыторыі Мінскай вобласці, не ўвайшла ў артыкул. Для даследавання былі выкарыстаны агульнанавуковыя, гістарычныя і культуралагічныя метады. Адной з галоўных крыніц асвятлення тэмы сталі ўліковыя дакументы музеяў.

Згодна з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб культуры (далей – Кодэкс) музейны прадмет – гэта культурная каштоўнасць [7, с. 138]. Гадзіннік як музейны прадмет ствараецца інтэлектуальнымі намаганнямі музейных работнікаў, якія ператвараюць прадмет у каштоўнае сведчанне. У працэсе непасрэднага вывучэння прадмета, звестак пра яго і асяроддзе яго бытавання, ідзе пашырэнне інфармацыйнага поля. У залежнасці ад атрымання крыніц інфармацыйнае поле падзяляецца на знешняе (даныя аб выглядзе, матэрыяле, надпісах і г. д.) і ўнутранае (звесткі аб аўтары, уладальніку, сацыяльным асяроддзі, гістарычных падзеях і г. д.).

Гадзіннікі валодаюць уласцівасцямі рэчавых крыніц і адначасова «прадметнай памяццю», інакш кажучы, паказваюць чалавеку «яго ўласнае адлюстраванне, нагадваюць яму пра яго самога, пра яго мінулае, пра яго продкаў і г. д.» [1, с. 20]. Яны могуць быць матэрыяльным увасабленнем гісторыі і культуры краіны, адметнымі ўзорамі гадзіннікавай вытворчасці, або належаць знакамітым асобам, быць узнагароднымі і стаць сямейнай рэліквіяй. Акрамя таго, гадзіннікі надзелены асаблівымі эмацыянальнымі атрактыўнымі і рэпрэзентатыўнымі рысамі. У складанай сістэме сацыяльных і культурных з'яў яны больш інфарматыўныя, паколькі выходзяць за межы штодзённага прадметна-прасторавага асяроддзя. Уключэнне гадзінніка ў фонды гарантуе яго доўгае музейнае жыццё. Дакладна апісаныя музейныя прадметы – гэта інфармацыйны патэнцыял, які неабходны ў рабоце музея.

У асноўным фондзе даследуемых музеяў Мінскай вобласці на момант падрыхтоўкі артыкула, па падліках аўтара, захоўваецца 1141 гадзіннік. Найбольш ранняя паступленні гадзіннікаў у музейны фонд зафіксаваны ў Мінскім абласным краязнаўчым музеі (1961)[2] і Слуцкім краязнаўчым музеі (1962)[3]. Самая вялікая колькасць гадзіннікаў прадстаўлена ў зборы Слуцкага краязнаўчага музея – 216 адзінак.

Камплектаванне музейнага фонду ў вывучаемых музеях ажыццяўляецца на сённяшні момант дзвюма шляхамі: куплі прадметаў музейнага значэння і атрымання іх у якасці ахвяраванняў. Іншыя формы камплектавання музейнага фонду, прадугледжаныя Кодэксам, у музеях Мінскай вобласці не зафіксаваны. Адзначым, што 1019 гадзіннікаў

[2] Архіў уліковай дакументацыі дзяржаўнай установы «Мінскі абласны краязнаўчы музей».

[3] Архіў уліковай дакументацыі дзяржаўнай установы «Слуцкі краязнаўчы музей».

(90 % ад агульнай колькасці) паступіла ў фонд музеяў у якасці ахвяравання. Толькі ў некаторых музеях адзначаны высокі працэнт закупкі гадзіннікаў: у Гісторыка-культурным музеі-запаведніку «Заслаўе» – 47 %, Слуцкім краязнаўчым музеі – 30 %, Нясвіжскім гісторыка-краязнаўчым музеі – 17 %. У зборы Мядзельскага музея народнай славы захоўваецца 5 адзінак гадзіннікаў, якія былі закуплены, што з'яўляецца выключэннем.

У музеях Мінскай вобласці захоўваюцца бытавыя гадзіннікі: будзільнікі (64), камінныя (4), кішэнныя (87), наручныя (487), настольныя (238), насценныя (240), падлогавыя (5); гадзіннік-кулон (2), гадзіннік-пярсцёнак (1), гадзіннік-брэлок (4), працэдурны (2), шахматны (2), секундамер (1), пясочны (4). Як можна заўважыць, больш за ўсё ў музейным фондзе захоўваецца наручных гадзіннікаў (43 % ад агульнай колькасці), насценных (21 %) і настольных (20 %), што разам складае 84 % ад усіх гадзіннікаў.

У беларускіх музеях згодна з Кодэксам класіфікацыя музейных прадметаў ажыццяўляецца па тыпах і відах [7, с. 139]. На падставе гэтай класіфікацыі і асаблівасцей, прынятых у тым ці іншым музеі, ажыццяўляецца сістэматызацыя музейных прадметаў па калекцыях. Гадзіннікі адносяцца да рэчавага тыпу музейных прадметаў. У большасці музеяў Мінскай вобласці гадзіннікі захоўваюцца ў калекцыі «Рэчы» ці «Рэчавыя помнікі» (Дзяржынскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей, Капыльскі раённы краязнаўчы музей, Любанскі музей народнай славы, Барысаўскі аб'яднаны музей, Вілейскі краязнаўчы музей, Чэрвеньскі раённы краязнаўчы музей, Лагойскі гісторыка-краязнаўчы музей імя Канстанціна і Яўстафія Тышкевічаў, Мядзельскі музей народнай славы, Івянецкі музей традыцыйнай культуры, Музей-сядзіба «Дзяржынава»).

Менш распаўсюджанай з'яўляецца сістэматызацыя гадзіннікаў па віду. Так, у Старадарожскім гісторыка-этнаграфічным музеі, Пухавіцкім раённым краязнаўчым музеі, Жодзінскім краязнаўчым музеі, Музеі гісторыі Клеччыны гадзіннікі захоўваюцца ў калекцыі «Механізмы», у Крупскім раённым гісторыка-краязнаўчым музеі – у калекцыі «Гісторыя тэхнікі», у Мінскім абласным краязнаўчым музеі – у калекцыі «Прыборы, апараты, механізмы». У некаторых музеях сістэматызацыя музейных прадметаў пашырана і дазваляе ажыццявіць іх інтэрпрэтацыю як разнапланавых крыніц ведаў. У Слуцкім краязнаўчым музеі гадзіннікі захоўваюцца ў музейных калекцыях: «Рэчавыя помнікі», «Механізмы. Дэталі механізмаў», «Этнаграфія і побыт», «Нумізматыка». У Гісторыка-культурным музеі-запаведніку «Заслаўе» гадзіннікі аднесены да калекцый «Абсталяванне жылля (дрэва)», «Адзенне», «Узоры прамысловай прадукцыі», ва Уздзенскім раённым гісторыка-краязнаўчым музеі – «Механізмы» і «Рэчавыя помнікі». Нясвіжскі гісторыка-краязнаўчы музей гадзіннікі захоўвае ў калекцыях «Рэчы» і «Персанальныя калекцыі». Адзіны музей, дзе вылучана асобная калекцыя па разнавіднасці

«Гадзіннікі» – Салігорскі краязнаўчы музей[4]. З 1989 г. па 2002 г. гадзіннікі ў музеі адносілі да агульнай калекцыі «Рэчавыя помнікі», а з 2003 г. была створана асобная калекцыя «Гадзіннікі».

Задачай любога музея з'яўляецца не толькі захаванне гадзіннікаў як матэрыяльных прадметаў, але і раскрыццё магчымасцей іх уключэння ў прастору сучаснай культуры. Да асноўных спосабаў актуалізацыі гадзіннікаў адносяцца музейная экспазіцыя, культурна-адукацыйная і навуковая дзейнасць.

У музеях Мінскай вобласці гадзіннікі як носьбіты культурнай інфармацыі разглядаюцца ў аспекце іх актуалізацыі экспазіцыйнымі метадамі.

Музейная экспазіцыя – гэта ўнікальная прастора культуры, якая мае сістэмную класіфікацыю, паслядоўнасць прадстаўлення экспанатаў, пэўную суаднесенасць знакаў і культурных кодаў і адлюстроўвае рэчаіснасць праз экспанаты, што прыцягвае ўвагу наведвальнікаў. Музейны вобраз з выкарыстаннем аўтэнтычных прадметаў становіцца больш пераканаўчым, чым гістарычныя вобразы, створаныя пры дапамозе наратыву.

Уласцівасці гадзіннікаў (экспрэсіўнасць, атрактыўнасць, інфарматыўнасць, асацыятыўнасць) дапамагаюць паспяхова функцыянаваць у сферы экспазіцыйнай дзейнасці. Можна вылучыць два віды ўзаемадзеяння гадзіннікаў (музейнага аб'екта) і прасторы (экспазіцыі). У першым выпадку гадзіннікі ўпісваюцца ў прадметнае асяроддзе музейнай экспазіцыі. Экспазіцыя ў дадзеным выпадку – цэласная, адзіная, яе немагчыма падзяліць. Аб'екты тут значныя толькі ў адзіным кантэксце, экспанат «уключаецца ў сюжэт і дзеянне» [9, с. 10]. Гэта характэрна для агульнагістарычных, тэматычных і мемарыяльных экспазіцый.

Як прыклад актуалізацыі гадзіннікаў у музеях Мінскай вобласці адзначым пастаянныя агульнагістарычныя экспазіцыі: «Культура Мінскага краю XIX ст.» і «Гісторыя Міншчыны са старажытных часоў да пачатку XX ст.» (Мінскі абласны краязнаўчы музей), «Па старонках гісторыі Жодзіна» (Жодзінскі краязнаўчы музей) і часовыя экспазіцыі: «Гарадскі быт» і «Лёс чалавека. У полымі часу» (Вілейскі краязнаўчы музей, 2018, 2021) і інш.

На часовых тэматычных экспазіцыях гадзіннікі дапамагаюць выяўляць сувязь з пэўным гістарычным часам і эпохай, чытацца праз асацыяцыі [6, с. 127]. Пераважная большасць гадзіннікаў у зборах музеяў з'яўляецца прадуктам савецкай вытворчасці, таму яны заўсёды прысутнічаюць на тэматычных выстаўках, прысвечаных савецкаму перыяду: «Мая Радзіма СССР» (Крупскі гісторыка-краязнаўчы музей, 2023), «Наш адрас – Савецкі Саюз» (Нясвіжскі гісторыка-краязнаўчы музей, 2016), «У сэрцы – камсамол» (Вілейскі краязнаўчы музей, 2018), «Рэха

[4] Архіў уліковай дакументацыі дзяржаўнай установы культуры «Салігорскі краязнаўчы музей».

рэвалюцыі» (Лагойскі гісторыка-краязнаўчы музей імя Канстанціна і Яўстафія Тышкевічаў, 2022) і інш.

Адна з галоўных тэм часовых экспазіцый у музеях – Вялікая Айчынная вайна. На тэматычных выстаўках, прысвечаных вайне, гадзіннік экспануецца як гістарычны артэфакт, як варыянт узнагароды, як сімвал часу, жыцця і смерці. Сярод выставак, на якіх былі выкарыстаны гадзіннікі, можна адзначыць: «Зброя і побыт партызан», «80 гадоў партызанскай брыгадзе "Дзядзя Коля"» (абедзве праходзілі ў Барысаўскім аб'яднаным музеі ў 2022 г.), «Што было, не забудзем» (Мінскі абласны краязнаўчы музей, 2021), «Мы памятаем! Мы ганарымся!», «Вялікая Айчынная вайна праз прызму часу», «Вайна. Перамога. Памяць» (усе ў Вілейскім краязнаўчым музеі, 2019–2020), «Вялікая Айчынная вайна» (Жодзінскі краязнаўчы музей) і інш.

Гадзіннікі, звязаныя з жыццём выбітнага чалавека, у найвышэйшай ступені садзейнічаюць эмацыянальнаму ўздзеянню экспазіцыі на наведвальніка. Сярод значных праектаў і экспазіцый з уключэннем мемарыяльных гадзіннікаў адзначым Нясвіжскі гісторыка-краязнаўчы музей, Жодзінскі краязнаўчы музей, Мінскі абласны краязнаўчы музей. Нясвіжскі гісторыка-краязнаўчы музей распрацаваў і рэалізаваў часовыя экспазіцыі, прысвечаныя выбітным дзеячам культуры – кампазітарам П. М. Касачу і І. Ц. Троску: «Нясвіжскія музыкі: Троска І. Ц., Касач П. М.» (2012), «Дзве гамы аднаго натхнення» (2017), «Славутыя асобы майго краю» (2018). У Жодзінскім краязнаўчым музеі ў 2017 г. у фармаце праекта «Жодзіна – горад навукоўцаў» адкрылі «Кабінет вучонага», прысвечаны С. І. Плешчанку. Прадстаўленыя на выстаўцы гадзіннікі былі перададзены ў музей нашчадкамі С. І. Плешчанкі. Гадзіннікі ўвайшлі ў экспазіцыі цыкла мемарыяльных выставак «Ганарымся нашымі землякамі» (2021–2022) у Мінскім абласным краязнаўчым музеі.

Гадзіннік як прадмет з высокай ступенню атрактыўнасці здольны самастойна ўздзейнічаць на наведвальніка. Дадзены спосаб характэрны для сістэматычных экспазіцый: «Шчаслівыя гадзін не назіраюць» (Лагойскі гісторыка-краязнаўчы музей імя Канстанціна і Яўстафія Тышкевічаў, 2023), «У палоне часу» (Нясвіжскі гісторыка-краязнаўчы музей, 2013), «Дзе жыве зязюля?» (Салігорскі краязнаўчы музей, 2017) і інш.

Варта адзначыць выстаўкі, прысвечаныя рарытэтам – рэдкім музейным прадметам, дзе атрактыўныя ўласцівасці гадзіннікаў маюць навуковую, гістарычную і эстэтычную каштоўнасці: «Бенефіс музейных рарытэтаў», «Пра што расказваюць музейныя прадметы» (абедзве ў Нясвіжскім гісторыка-краязнаўчым музеі, 2020–2021) і інш.

Асобна адзначым адну з новых форм актуалізацыі музейных прадметаў – віртуальную выстаўку. Музей гісторыі Клеччыны прадставіў амаль усю калекцыю гадзіннікаў на віртуальнай выстаўцы «Магія часу» (Музей гісторыі Клеччыны, 2022) [11].

На пастаянных экспазіцыях музеяў Мінскай вобласці прадстаўлена 58 гадзіннікаў (5 % ад агульнай колькасці). Гэта звязана з аб'ектыўнымі фактарамі: невялікія экспазіцыйныя плошчы, адсутнасць пастаяннай экспазіцыі і г. д. Гадзіннікі асабліва запатрабаваны на часовых экспазіцыях – найбольш дынамічнай форме выставачнай дзейнасці. У музеях Мінскай вобласці на часовых экспазіцыях за апошнія 10 гадоў, па падліках аўтара, было прадстаўлена 278 гадзіннікаў (24 % ад агульнай колькасці).

Інфармацыя, якую наведвальнікі атрымліваюць, назіраючы за адным і тым жа прадметам, можа змяняцца. Так, у калекцыі Крупскага гісторыка-краязнаўчага музея захоўваецца наручны гадзіннік «Командирские» Чыстапольскага гадзіннікавага завода з дароўным надпісам «30 лет Победы в Великой Отечественной войне от МО 1975» – мемарыяльны прадмет выдатнага ўраджэнца Крупскага раёна, Героя Савецкага Саюза М. Я. Зайцава (1923–2012) (дзяржаўная ўстанова культуры «Крупскі гісторыка-краязнаўчы музей», КП 006631). Гадзіннік у залежнасці ад мэт экспазіцыі паспяхова можа быць выкарыстаны на мемарыяльнай экспазіцыі, на выстаўцы, прысвечанай Вялікай Айчыннай вайне, як адзін з адметных узораў гадзіннікавай вытворчасці, які належыць пэўнаму часу/эпосе.

Інфарматыўнасць рэчы – ключавы элемент культурнай памяці. Свет рэчаў – «самая надзейная крыніца інфармацыі пра эпоху, якая яе стварыла» [3, с. 23].

Гадзіннік як аўтэнтычны артэфакт эпохі дазваляе пранікнуць у прадметны свет іншых часоў і асэнсаваць працэс мадэрнізацыі культуры. Пасля ўключэння ў музейны збор ён як любы матэрыяльны прадмет губляе сувязі з асяроддзем бытавання і функцыянальнае прызначэнне, застаючыся нязменным толькі ў плане атрыбутыўных уласцівасцей (форма, памер і г. д.). Пасля вывучэння і фіксацыі інфармацыйнага поля гадзіннік ператвараецца ў сімвал працэсаў і з'яў былога асяроддзя.

У музеях Мінскай вобласці захоўваюцца выключна бытавыя гадзіннікі. Наручныя, насценныя, настольныя складаюць 84 % ад агульнай колькасці. Якасны стан існуючых калекцый адлюстроўвае неабходнасць пашырэння разнастайнасці відаў гадзіннікаў пры фарміраванні музейных фондаў. Захоўванне гадзіннікаў у складзе асноўнага фонду музеяў Мінскай вобласці не ўніфікавана (іх адносяць да розных калекцый).

Вывучэнне гадзіннікаў у музеях спрыяе іх актуалізацыі і пашырэнню культуралагічных ведаў. Асноўная форма актуалізацыі гадзіннікаў у музеях Мінскай вобласці – экспазіцыйная. Яны прадстаўляюцца наведвальнікам у мастацка-гістарычным кантэксце як поліінфарматыўныя крыніцы: прадмет побыту, узор гадзіннікавай вытворчасці, сімвал часу. Гадзіннікі, якія маюць гістарычную, мемарыяльную, эстэтычную і мастацкую каштоўнасці, найбольш запатрабава-

ны ў музейных выстаўках, асабліва ў часовых экспазіцыях. Унікальнасць гадзіннікаў як «цікаючых» экспанатаў музеяў заключаецца ў тым, што кожны з іх з'яўляецца своеасаблівым помнікам часу, які захапляе наведвальнікаў падарожжам у свет гадзіннікавых тэхналогій.

Гадзіннік – гэта ўзор матэрыяльнай культуры, крыніца інфармацыі аб розных аспектах сацыяльнай рэчаіснасці, гісторыі, культуры, гаспадарчай дзейнасці, аб бытавых і эстэтычных уяўленнях людзей. Інфармацыя, якую захоўваюць і транслююць гадзіннікі як музейныя прадметы, будзе садзейнічаць стварэнню ў музеях Мінскай вобласці адпаведнага культурна-гістарычнага асяроддзя і фарміраванню новых культурных форм.


1. *Ассман, Я.* Культурная память: Письмо, память о прошлом и политическая идентичность в высоких культурах древности / Ян Ассман ; пер. с нем. М. М. Сокольской. – М. : Яз. славянской культуры, 2004. – 368 с.

2. *Барашев, П.* Пять часов с Юрием Гагариным : репортаж с борта самолета «Ил-18» / П. Барашев, В. Песков // Комсомольская правда. – 1961. – 14 апр. – С. 4.

3. *Ванюшкина, Л. М.* Исследование вещи как фактор развития исследовательских навыков студентов художественного вуза / Л. М. Ванюшкина, С. А. Тихомиров // Мир науки, культуры, образования. – 2019. – № 3 (76). – С. 22–25.

4. *Жук, Л.* Часы французских производителей в фондах музея-заповедника «Несвиж» / Людмила Жук // Нясвіжскі замак: падзеі, асобы, спадчына : матэрыялы Міжнар. навук. канф., прысвеч. 435-годдзю пачатку будаўніцтва Нясвіжскага замка, Нясвіж, 6–7 верас. 2018 г. / уклад.: А. У. Блінец, С. М. Клімаў. – Нясвіж, 2019. – С. 262–269.

5. *Зварыка, І.* Гадзіннік акадэміка Нікольскага. Невядомыя надпісы / Ірына Зварыка // Музейны весн. : зб. / Нац. гіст. музей Рэсп. Беларусь. – 2018. – Вып. 6. – С. 93–98.

6. *Кнабе, Г. С.* Избранные труды: Теория и история культуры / Георгий Кнабе ; отв. ред. Н. И. Кузьменко. – М. ; СПб. : Летний сад : РОССПЭН, 2006. – 1200 с. : портр.

7. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры : прыняты Палатай прадстаўнікоў 24 чэрв. 2016 г. : адобр. Саветам Рэсп. 30 чэрв. 2016 г. : па стане на 6 лют. 2023 г. – Мінск : Нац. цэнтр прававой інфармацыі Рэсп. Беларусь, 2023. – 280 с.

8. *Копытофф, И.* Культурная биография вещей: товаризация как процесс / И. Копытофф // Социология вещей : сб. ст. / под ред. В. Вахштайна. – М., 2006. – С. 134–167.

9. *Майстровская, М.* Музейная экспозиция: тенденции развития / М. Майстровская // Музейная экспозиция (теория и практика, искусство экспозиции, новые сценарии и концепции) / редкол.: М. Т. Майстровская (отв. ред.) ; Рос. ин-т культурологии. – М., 1997. – С. 7–22.

10. Музей // Словарь актуальных музейных терминов / авт.-сост.: М. Е. Каулен [и др.]. – М., 2009. – Вып. 5. – С. 55–56.

11. Музей гісторыі Клеччыны [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://youtube.com/@user-gg5ze9fd4b. – Дата доступу: 12.02.2024.

12. *Селивончик, А. И.* Реставрация и атрибуция музейного предмета – настенные часы НД 433; Мч – «Музыкальные инструменты и часы» / А. И. Селивончик // Памяць продкаў праз музейны свет: мінулае, сучаснасць і будучыня музеяў пад адкрытым небам : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 26 кастр. 2018 г. / склад. Я. І. Мікула. – Мінск, 2018. – С. 106–116.


Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 09.04.2024.